ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 103 | СУБОТА, 6 МАЯ 1933 г. | № 103

АБ РЭАЛІЗАЦЫІ РАШЭНЬНЯЎ ЦК І ЦКК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ад 29 красавіка 1933 г.

Пастанова сэкратарыяту гаркому КП(б)Б ад 3 мая 1933 г.

1. Абавязаць усе ячэйкі КП(б)Б да 25 мая прапрацаваць рашэньні ЦК і ЦКК УсеКП(б) ва ўсіх партзьвеньнях: цэхячэйках, партгрупах, увязваючы гэту праапрацоўку з задачамі авангардной ролі камуністаў у барацьбе за выкананьне якасных паказальнікаў прамфінпляну на прадпрыемствах, за тэмпы і якасьць сяўбы, за якасьць вучобы ў ячэйках навучальных устаноў. Упаўнаважаным ГК па сельсаветах арганізаваць праапрацоўку гэтага рашэньня па калгасных, савгасных і сельсавецкіх ячэйках.

2. Культпропу правесьці інструкцыйную нараду прапагандыстаў нізавой сеткі партасьветы аб мэтах і парадку праапрацоўкі рашэньня ЦК і ЦКК у сетцы партасьветы.

3. Прапанаваць усім ячэйкам, якія яшчэ ня склалі характарыстык на кожнага камуніста і не абгаварылі іх на пасяджэньнях бюро (у невялікіх ячэйках характарыстыкі абгаварваюць на сходах, а ў ячэйках з вялікай колькасьцю камуністаў—на пашыраным пасяджэньні бюро), скончыць гэта не пазьней 15 мая. Парткалектывы і ячэйкі, якія не абгаварылі характарыстыку работы парткалектыву і ячэйкі, абавязаны абгаварыць гэткую да 15 мая.

4. На бліжэйшым пасяджэньні бюро гаркому КП(б)Б заслухаць прапановы т. Вэнзэля аб персанальным складзе праверачных камісій.

5. Склікаць 9 мая нараду актыву па абгаварэньні рашэньняў ЦК і ЦКК. Даклад даручыць т. Вэнзэлю. Падрыхтоўку ўскласьці на т. Кофмана.

Сэкратар гаркому КП(б)Б Міцькоў.

ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў СПАБОРНІЦТВЕ ТРОХ РАЁНАЎ.

ГАНЕБНЫ ЗРЫЎ УСТАНОЎЛЕНЫХ ТЭРМІНАЎ СЯЎБЫ — ПРОСТЫ ВЫНІК ЗЛАЧЫННАГА СУПРАЦІЎЛЕНЬНЯ АПАРТУНІСТЫЧНЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ ВЫКАНАНЬНЮ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ

Разграміць агентуру кулацтва, разьбіць апартуністычныя разважаньні і спасыланьні на „аб'ектыўныя" прычыны

Засяваць штодзённа 2500 га — справа гонару бальшавікоў Віцебшчыны.

АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ ПА РАЁНЕ.

Пастанова бюро гаркому КП(б)Б ад 5 мая 1933 г.

ГК КП(б)Б канстатуе абсалютна нездавальняючы ход сяўбы па раёне па ўсіх сэктарох. Па становішчы на 3 мая засеяна 1500 га ці толькі каля 4 проц. пляну.

Такі ганебны зрыў устаноўленых тэрмінаў сяўбы тлумачыцца апартуністычным і проста злачынным супраціўленьнем правядзеньню сяўбы з боку кіраўнікоў савгасаў, каапгасаў, калгасаў па матывах „дрэннага надвор'я", „сырой глебы" і г. д. ГК лічыць абсалютна нецярпімым і недапушчальным такое становішча, калі ні сельсаветы і парт'ячэйкі, ні нават упаўнаважаныя ГК не даюць патрэбнага адпору такім апартуністычным разважаньням.

Першыя дні сяўбы паказваюць нездавальняючую настаноўку арганізацыі працы (позьні выхад на работу а 8—9 гадз., а па радзе каапгасаў і калгасаў нават а 10—11 гадз.), адсутнічае рашучая барацьба з гультаямі, прагульшчыкамі і разгільдзяямі.

Не ўстаноўлены строгі кантроль за якасьцю работы (ворыва з агрэхамі), ня вытрымліваюцца нормы высеву, робіцца пасеў у аднавор, несваечасовая запашка і задзелка высяваемых збожжавых (каапгасы „МОПР" і «Білева»).

Маюць месца выпадкі нездавальняючай задзелкі насеньня (у калгасе „Чухвары" 25 проц. насеньня пасьля засеву брыгадай Сарокіна засталося наверсе ў выніку дрэннай запашкі).

Ня выконваецца ўказаньне ўраду аб зьніжэньні і павышэньні расцэнак работы за якасьць ворыва і сяўбы.

Нездавальняючая работа трактароў (прастоі, частае нсаваньне, адсутнасьць на месцы неабходных запчастак). У большасьці трактароў няма ліхтараў для начной работы і г. д.

Выходзячы з гэтага, гарком КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць старшынь калгасаў, дырэктароў савгасаў, каапгасаў, старшынь сельсаветаў, сэкратароў ячэек і ўпаўнаважаных гаркому безадкладна спыніць апартуністычную балбатню аб немагчымасьці сяўбы, безгаварачна разгарнуўшы масавую сяўбу паўсемясцова.

2. Устанавіць канчатковы тэрмін скончэньня сяўбы аўсу да 10 мая, бульбы—15 мая і ільну—20 мая, арганізаваўшы адначасова масавую сяўбу гародніх культур.

Устанавіць штодзённае заданьне сяўбы па раёне, з разьліку скончыць сяўбу да 20 мая, ня менш 2500 га.

Штодзённа засяваць ня менш 2500 га—баявая задача бальшавікоў нашага раёну. Зацьвердзіць аперацыйнае штодзённае заданьне па сельсаветах, абавязаўшы сельсаветы, парт'ячэйкі, упаўнаважаных гаркому зараз жа даць штодзённыя заданьні калгасам, аднасобным пунктам, арганізаваўшы выкананьне іх (заданьняў) і аперацыйнае кіраўніцтва.

3. МТС, гарЗА, упаўнаважаным гаркому і мясцовым арганізацыям прыняць рашучыя захады да ўмацаваньня працоўнай дысцыпліны, вядучы рашучую барацьбу са спазьненьнем рабочых і калгасьнікаў на работу, з дробнабуржуазным разгільдзяйствам і лодырніцтвам. Устанавіць строга дакладны час выхаду ў поле і перапынкаў, забясьпечыўшы раньні выхад у поле, бяручы прыклад з перадавых калгасаў, дзе фактычна работа непасрэдна ў полі пачынаецца не пазьней 6 гадз. раніцы.

4. Устанавіць стражайшы кантроль за якасьцю сяўбы, абавязкова прымаючы па актах якасьць падрыхтоўкі глебы і сяўбы.

Катэгарычна забараніць сяўбу ў аднавор, забясьпечыўшы лепшую падрыхтоўку глебы для пасеву.

5. За дрэнна праведзеную запашку 2,5 га аўсу, у выніку чаго 25 проц. збожжа засталося незапаханым, даручыць праўленьню калгасу „Чухвары" прыцягнуць да адказнасьці брыгадзіра Сарокіна. Папярэдзіць усіх старшынь калгасаў і дырэктароў савгасаў, што гарком будзе строга караць кожнага, хто сваімі нядбайнымі адносінамі будзе дапушчаць дрэнную якасьць сяўбы.

6. Абавязаць дырэктароў савгасаў, каапгасаў і старшынь калгасаў арганізаваць падвоз корму для падкорму коняй у час перапынкаў на сьнеданьне і полудзень непасрэдна ў полі бяз прыезду ў гаспадарку, што скараціць непатрэбныя прагоны коняй. Забясьпечыць адначасова дастаўку ў поле харчаваньня для людзей. Прыезд у гаспадарку можна рабіць толькі ў час абедзенага перапынку.

7. Абавязаць т. Галавёнка і дырэктароў савгасаў і каапгасаў на справе забясьпечыць работу трактароў ня менш 20—21 гадзіны ў суткі, арганізаваўшы неабходны інструктаж, своечасовую дастаўку гаручага і запчастак. На працягу сутак забясьпечыць усе трактары ліхтарамі для работы ўначы.

У сувязі з тым, што апарат палітаддзелу МТС яшчэ ня створаны і ўлічваючы дрэнную работу МТС, вылучыць упаўнаважаным гаркому па кантролі за работай МТС тав. Юдашкіна.

8. Праверкай устаноўлена, што ва многіх калгасах несваечасова заліскваюцца працадні калгасьнікам, у сувязі з чым абавязаць упаўнаважаных гаркому паўсемясцова праверыць запіс працадзён., забясьпечыўшы запіс гэткіх у працоўныя кніжкі не радзей аднаго разу ў пяць дзён.

9. Абавязаць рэдакцыю газэты „Віцебскі пралетары" арганізаваць больш баявое асьвятленьне ходу сяўбы.

10. Лічыць недапушчальным, што вызначаныя гаркомам ЛКСМБ для камандыраваньня на сяўбу 15 работнікаў да гэтай пары ня выехалі. Прапанаваць бюро гаркому ЛКСМБ прыцягнуць да адказнасьці таварышоў, якія ня выехалі, забясьпечыўшы ім безадкладны выезд.

11. Дадаткова камандыраваць упаўнаважанымі па сяўбе: т. Гаеўскага — Мікалаёўскі сельсавет, т. Леўшына—у Бабініцкі сельсавет, т. Валчка—у Ялагінскі сельсавет, т. Эстрына—у Замасточкі сельсавет і т. Крымкевіча.

12. Гарком папярэдзвае ўсіх упаўнаважаных гаркому, сэкратароў парт'ячэек і старшынь сельсаветаў, што ўсялякія спасыланьні на няспрыяючае надвор'е, адсутнасьць насеньня і іншыя „аб'ектыўныя" прычыны б дудь разглядацца як проста спробы да зрыву пляну сяўбы, з прыцягненьнем вінаватых да суровай адказнасьці.

Сэкратар гаркому КП(б)Б Міцькоў.

ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ СЯЎБЫ Ў КАЛГАСАХ.

(У процантах).

МАШКАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„Бальшавік"	14,8
„Чырвоны Кастрычнік"	11,2
Імя Сталіна	9,2
Імя Калініна	1,6

ЗАМАСТОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

Імя „Правды"	14,0
„М. Чэрніца"	10,2
„Замасточча"	8 3
„Чырвоны араты"	6,2
„Скрыдлёва"	5,7
„Чырвоны партызан"	5,7
„Шчамілаўка"	2,6
Імя Варашылава	1,9

СТАРАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„Свабода"	38 5
„Камунар"	14,9
„Тружанік"	14,7
Імя 1-га мая	9,2
„Новае жыцьцё"	1,7

ДАЎЖАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„Шлях Ільліча"	2,5
„Новы шлях"	1,8
„Сілач"	1,5

ШУМНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„Іскра ленінская"	9,7
„Зорка"	10
„Новы сьвет"	9,9
„Парыская камуна"	6,0
„Пяцігодка—за 4 гады"	4,7
Імя Будзёнага	5,4
Імя Молатава	4,4

РУДАКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

Імя Чарвякова	6,0
Імя Сталіна	4,6
„Шлях да сацыялізму"	4,6
„Дырыжабль"	3,5
„Чухвары"	3,1

МІКАЛАЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„Пабеда"	13,3
„Серп і молат"	12,4
Імя Леніна	10,9
„Колас"	9,5
„Новы шлях"	8,9
„Чырвоны двор"	8,1
„Чырвоны Кастрычнік"	6,5
„Маркавічы"	3,6
„Барэц"	3,8
„Сілач"	2,9

В.-ЛЁТЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„Заходняя Дзьвіна"	31,0
„Культфронт"	15,9
„Бяроза"	13,4
„Віцебскі пралетары"	8,5
„Пабеда"	8,4

ЯЛАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

„2-я бальшавіцкая вясна"	31,2
„Чырвоны ўдарнік"	22,9
Імя Чырвонай арміі	11,4
„Чырвоны араты"	11,1
Імя Гамарніка	10,8
„Барацьбіт"	8,7
„Капачова"	5,2

ЧОРНЫ СЬПІС калгасаў, якія яшчэ не распачалі сяўбы.

Назва калгасу	Прозьвішча старшыні калгасу	Шэф калгасу
Замасточкі с.-с. «Зарыбнікі»	Шчасноўскі	МК мэдсанпрац чыгункі
«Уперад»	Балткоў	МК вагонкі
Імя Яраслаўскага	Галубцоў	МК № 1 чыгун
В. Чэрніца	Карчэўскі	МК № 1 чыгун
Вусьце	Мураўёў	Райкіраўніцтв чыгункі і II ку пэдінстытуту
«Чырвоная зорка»	Камлёў	МК № 1 чыгун
Шумнянскі с.-с «Камінтэрн»	Яшчэнка	МК нарсувязі
В.-Лётчан. с.-с. «Молат»	Шкепіст	
Даўжанскі с.-с. «Інтэрнацыянал»	Пазьнякоў	Фабр. „Дзьвіна

Арганізаваць работу на палёх.

(Ад нашага спэцкора).

Калгас „Пяцігодка—за чатыры гады", Шумнянскага сельсавету, лічыцца перадавым калгасам. Ён першы справіўся з уборачнай кампаніяй 1932 г, акуратна здаў дзяржаве прылічваючуюся сельска гаспадарчую прадукцыю. Аднак, казаць, што калгас дабіўся высокай ураджайнасьці зямлі—нельга. Ураджайнасьць яшчэ навысокая. У 1932 годзе ўраджайнасьць была наступная: жыта—6,7 цвт. з га, пшаніцы—6,3, ячменю—8,6, аўсу—5.68, бульбы—93,3, бабовых—4,6, сева—16,9 цвт. з га. Праўда, было некалькі га бульбы, засеяных на гародняй зямлі, якія далі больш 1 000 пудоў з га, буракі па 1 000 пудоў з га, але такіх га з высокай ураджайнасьцю ўсё-ж-такі ў калгасе мала.

Калгасьнікі ў 1932 годзе атрымалі на працадзень больш чым у 1931 годзе. На кожны працадзень прыпадала жыта 1083 гр., пшаніцы—24 гр, аблыг—94 гр., ячменю—337 гр., гароху—193 гр., коранплодаў—853 гр., бульбы—5510 гр., капусты—134 гр., сена—1454 гр, саломы—1506 гр., мякіны—781 гр., сілосу—960 гр і грошай па 2 р 10 кап. Калгас, бязумоўна, больш атрымаў-бы ўраджаю і больш-бы прыпадала на працадзень, калі-б у калгасе было зьвернута больш увагі на ўмацаваньне калгасных брыгад, лепшую арганізацыю ў іх працы, якія рашаюць посьпех работы калгасу.

Возьмем палаводчую брыгаду № 1 (брыгадзір Я Курыленка). Гэтая брыгада ў сваім складзе мае 28 мужчын, 28 жанчын і 1 падлётка. Брыгадзір Курыленка ведае толькі культур яму трэба пасеяць у гэту вясну, але ён яшчэ дакладна ня ведае, на якіх палавых вучастках ён будзе сеяць, бо граніцы палёў пэўна не паказаны, ніхто яму не ўказаў яго зямлю. Вытворчыя пляны-заданьні брыгадам склалі, але замест таго, каб уручыць іх кожнаму брыгадзіру і згодна пляну кожныя пяць дзён даваць вытворчыя заданьні, супакойна паклалі іх у шафу канторы Гэта не выпадкова, бо ў кіраўнікоў калгасу панує настрой: «Плян плянам, а работа работай»,—замест таго, каб у рабоце кіравацца плянам і штодзённа сачыць за яго выкананьнем.

У брыгадзе распачаліся палявыя работы. Выкананьне норм да гэтае пары нездавальняючае. Чаму так? Выключна таму, што, па-першае, зараз работаюць усяго толькі 6½—7 гадзін замест 10 На работу зьбіраюцца ў 7 гадзін, выходзяць у поле ў 8—9 гадзін. Работаюць да 12, потым абедзены перапынак да 2½—3 гадзін, пасьля работаюць з 3-х да 7-мі гадзін увечары.

У брыгадзе партмасавай работы пакуль няма У калгасе маюцца два члены партыі і адзін кандыдат Сарокін—старшыня калгасу, Арпёменка Апанас—брыгадзір другой брыгады і Курыленка Мікіта—радавы калгасьнік (першай брыгады), ды яшчэ камсамольская ячэйка з 7 мі чалавек. Між тым, ні ў адной з брыгад (а брыгад маецца дзьве палаводчых і адна гародняя) няма такога прыкладу, каб партыйцы і камсамольцы сабраліся ды абмеркавалі вытворчыя пытаньні калгасу, рашаючыя „дробязі" калгаснага жыцьця.

Усё гэта гаворыць аб тым, што камуністы і камсамольцы ў калгасе „Пяцігодка—за чатыры гады" яшчэ не занялі авангардной ролі, ня віруюць і не арганізоўваюць работу ў калгасе, каб зрабіць яго сапраўды бальшавіцкім.

Р. Вярхоўскі.

Шкоднікі арудуюць.

МІКАЛАЁВА. 3. (Ад нашага спэцкора).

У калгасе «Чырвоны двор» вялікі прар у веснавой сяўбе. Засеяна толькі 10 га збо жавых культур і тыя не задзеланы да гэта часу.

Прычына гэтага прарыву тая, што пр леньне калгасу, у прыватнасьці старшы Каралёў, апартуністычна аднесьліся да весна сяўбы. Забраніваны фонд канцэнтраваных к моў разбазараны яшчэ з зімы, а зараз ко кормяць асакой.

Цяпер коні работаюць на полі толькі 3— гадзіны ў дзень, з прычыны таго, што я даведзены да такой ступені, што ня могу цягнуць плуг. Але прычына ня толькі ў др ным корме. Паасобныя калгасьнікі яўна шк ніцкі адносяцца да конскага паголоўя. Маю такія выпадкі, як з калгасьнікамі Маска вым М. і інш., калі апошнія забіваюць кон Знарок едуць з возам у балота, каб больш марыць коняй. Дастаткова прывесьці вытры з насьценгазэты калгасу, якая сапраўды бальшавіцку змагаецца за каня, але-ж, нажа праўленьне абыходзіць гэту газэту не рэагу чы на заметкі.

Маюцца выпадкі, калі ў брыгадзе па 3 ўстрайваюць п'янкі, ня выходзяць на рабо Калгасьнікі зьбіраюцца ў поле, а ня ведаю што рабіць, бо няма брыгадзіра. Такі выпад быў у брыгадзе № 2, калі брыгадзір Сьмір па некалькі дзён не зьяўляўся на работу час рэлігійных сьвят.

Дастаткова гэтых некалькіх прыкладаў, зразумець, чаму такімі маруднымі тэмпамі і веснавая сяўба ў калгасе.

Шыракоў

КІРАЎНІЦТВА ПАТУРАЕ ГУЛЬТАЯМ.

(Ад нашай выязной рэдакцыі).

Калгас «Дырыжабль», Рудакоўскага сельсавету, злачынна зацягвае сяўбу. На сёньняшні дзень не засеяна ніводнага га, а тэмпы ворыва ні ў якім выпадку не забясьпечваюць выкананьне ў тэрмін пляну сяўбы.

Праўленьне, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць, спасылаецца на „аб'ектыўныя" прычыны. За шырмай іх хаваецца абсалютнае няўменьне і нежаданьне брыгадзіра Зайцава і старшыні Гаўрылава віраваць сяўбой. У калгасе маецца падзеньне прадпісыпліны, дрэнна расстаўлена рабочая сіла. Так, брыгада «Камары» на 4-х конях узорвае толькі 0,23—0,25 га. У брыгадзе «Якушы» Калбасьцеў Павал, Матрона Мікалаева, Усьціньня Грышчанка 24 красавіка выпрацавалі толькі па 0,11 га на каня. Факт кажа сам за сябе. Наглядаюцца вялікія прагулы. На рэлігійнае сьвята „Раданіцу" брыгада «Камары» прагуляла палову дня, а за другую палову дня брыгада на 8 мі конях узарала 0,35 га. Кіраваў брыгадай лодыр Пахноцкі Міна, да гэтага аштрафаваны праўленьнем калгасу за прагулы на 5 працадзён.

Агульна прызнаная сыстэма ворыва—гэта ворыва гуськом, калі для большай урачыстасьці ў адзін рад становяцца па 6—10 коняй. Эфэктыўнасьць такой работы надзвычай нізкая, а брыгадзір Зайцаў—заядлы праціўнік другой, правільнай расстаноўкі сіл і гэтым самым зьвяўляецца непасрэдным віноўнікам зрыву работ. У сваім кансэрватызьме ён ідзе нават далей. У групе „Якушы" два добрасумленныя калгасьнікі Мікалаеў Андрэй і Мікалаева Ўсьціньня, не пажадаўшы цягнуцца з усімі, з мэтай большай выпрацоўкі, сталі асобна працаваць. Залічылі-ж ім адноллькава з усёй брыгадай. Такім чынам кіраўніцтва «дабіваецца» падвышэньня прадукцыйнасьці працы і добрасумленнай работы.

А ў той жа самы час апартуністычныя хныканьні і сьцьвярджэньні брыгадзіра і праўленьня ўшчэнт разьбіваюцца ўдарнай работай паасобных добрасумленных калгасьнікаў. На адноллькавых конях, як і ў астатніх брыгадах і нават горшых за камароўскіх, Буракоў Ігнат і Севастопалаў Цімох штодзень даюць па 0,4—0,45 га на каня з аднакове плугам. Гэтыя ўдарнікі проста завуляюць крыўдзяцца: «Як гэта праўленьне можа рыцца з тым, што нашы суседзі выпра ваюць па 0,15—0,2 га на каня".

Ад пасеўтройкі сельсавету ў складзе К беля, Сьцяпанава і Зіноўева чакаецца кар ная перабудова работы калгасу, каб забясь чыць пасьпяховае правядзеньне весна сяўбы.

Ф. Сурганаў, С. Рас

Вывесьці калгасы імя Леніна і „Іскра" з прарыву.

БАРАЎЛЯНЫ, 4. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Калгас імя Леніна плян ворыва выканаў на 28 проц.: узарана 113,73 га замест 400 Уперадзе па ворыве ідзе брыгада № 1, якая ўзарала 55,3 га. Адстае брыгада № 2, якая ўзарала 27,86 га. Тэмпы ворыва яўна нізкія. Нормы па ворыве ня выконваюцца, штодзённага вытворчага заданьня няма. Старшыня калгасу Чапяленка ўвесь час тлумачыць, што глеба не падрыхтавана да сяўбы, спасылаючыся на нізкую і мокрую глебу, у той час, як у брыгадах №№ 2 і 3 падрыхтавана глеба. Калгасу не хапае насеньня ўсіх культур, у прыватнасьці каля 200 цэнтнераў аўсу. Маецца засыпанага жыта і пшаніцы каля адной тоны, якое на насеньне не абмежена.

У калгасе маюцца выпадкі спазьненьня і нявыхаду на работу. Будзько А. мае тры прагулы, застаецца непакараным.

Камсамольская ячэйка ніякай работы ўнутры калгасу не праводзіць.

Калгасам „Расьсьвет" плян веснавой сяўбы выкананы на 9,8 проц. Сяўба 1 і 2 мая была сарвана.

Калгасу „Іскра" патрэбна засеяць каля 40 га розных яравых культур. У калгасе меліся ўсе магчымасьці для пасьпяховага выкананьня пляну сяўбы, але выканана толькі 0,26 проц. пляну. Прычына адставаньня тая, што ў калгасе не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не арганізавана праца калгасьнікаў.

Мясцовая парт'ячэйка ў дапамогу калгасу „Іскра" прымацавала калесьнікава, прысланага гаркомам, але ж апошні на працягу двох тыдняў не зрабіў рашучага пералому ў бок павышэньня тэмпаў сяўбы, а сваёй бязьдзейнасьцю і апартуністычным разважаньнем аб „мокрай зямлі" і самавольнымі адлучкамі ў горад садзейнічаў паглыбленьню прарыву.

29 красавіка калесьнікаў самавольна кінуў калгас і ўшоў у горад, адкуль не зьявіўся і 3 мая.

Спадзяемся, што гарКК зацікавіцца тварам Калесьнікава і зробіць адпаведныя вынікі.

Севасьцеенка.

Разгортваецца работа нізавога друку.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

На бюро старасельскай парт'ячэйкі была распрацавана пастанова гаркому КП(б)Б аб узмацненьні селькораўскага руху. Па гэтай пастанове быў намечаны рад канкрэтных мерапрыемстваў: праверыць сацыяльны склад рэдкалегій і аформіць іх, стварыць рэдкалегію газэты пры сельсавеце У склад рэдкалегіі вылучаны сэкратар сельсавету Казлоў (член партыі), трактарыст Дамарацкі (член партыі) і камсамолец Цюрыкаў. Рэдактарам абраны тав. Казлоў.

На адбыўшымся пашыраным партсходзе сумесна з рэдактарамі васьценгазэт, селькорамі і делегатамі першага раённага зьезду калгасьнікаў ударнікаў быў заслуханы даклад аб удзеле селькораў у пасеўнай кампаніі і перабудове работы нізавога друку.

На сходзе выступілі калгасьнікі, якія адзначылі, што не ва ўсіх калгасах выпускаюцца газэты. Так, напрыклад, у калгасе «Свабода» за пачатак 1933 г. ня выйшаў ніводны нумар газэты, у калгасе «1 мая» выйшаў толькі а нумар. На сходзе былі намечаны канкрэт мерапрыемствы па паляпшэньні работы ніз га сельскага друку. Агульны сход таксама станавіў уключыцца ў конкурс насьценгазэт лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

Зараз у чатырох калгасах: «Новае жыцьц «1 мая», «Тружанік» і «Свабода» пераабр рэдкалегіі. Абраны дзьве рэдкалегіі брыгад газэт у калгасе „Камунар", дзьве брыгад рэдкалегіі ў калгасе „Новае жыцьцё", дзьв калгасе «1 мая», адна ў калгасе «Тружані адна ў Шчыранскім пункце аднаасобнага тару.

Газэты выходзяць рэгулярна ў пяці ка сах і чатырох брыгадах. Насьценгазэта рэгу на выходзіць і на Шчыранскім пункце а асобнікаў. Кожнай рэдкалегіяй брыгаднай і газэтнай газэты выпрацаваны дакады п работы.

Г

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

ПАРТЫЯ ПАЧЫНАЕ ПРАВЕРКУ СВАІХ РАДОЎ.

Кожны вясковы камуніст будзе правярацца, у першую чаргу, па яго рабоце ў выкананьні заданьняў партыі, па яго барацьбе за ўмацаваньне калгасаў і пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

У ПАЛОНЕ АПАРТУНІСТЫЧНАГА САМАЦЁКУ.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Пры распрацоўцы рашэньняў ЦК КП(б)Б аб рабоце двох калгасных ячэек і аб арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад на партсходзе Даўжанскай ячэйкі КП(б)Б выявіўся сапраўдны твар камуністаў-„шляп“ з ліку паасобных старшынь калгасаў і брыгадзіраў.

Выступленьні асобных партыйцаў і кіраўнікоў калгасаў красамоўна сьведчаць аб апартуністычным разважаньні гэтых гора-кіраўнікоў калгаснай вытворчасьці, аб непаваротлівасьці, аб саноўна барскіх адносінах да сяўбы гэтага году, гэтага „галоўнага бою“ арміі калгасьнікаў.

Вось брыгадзір 5-й брыгады калгасу «Інтэрнацыянал» кандыдат партыі Котаў. Ён ня толькі не забясьпечыў працоўнай дысцыпліны ў брыгадзе, але былі выпадкі, калі сам ня выходзіў на работу (15 і 16 красавіка). Брыгада Котава выходзіць толькі а 9 гадзіне раніцы на работу, яна апошняя з усіх брыгад. Гэты, з дазволу сказаць „камуніст“ выступіў на сходзе партячэйкі з разважаньнямі, што ў яго не хапае людзей, што ў яго наогул «слабая» брыгада, якая ня здолее выконваць плянавыя заданьні на полі. Вось чаму ў яго ў брыгадзе, моў, узарана толькі 65 га зямлі пры пляне ў 100 га. Усё гэта Котаў заявіў у той час, калі яго брыгада складаецца з самых працаздольных калгасьнікаў.

Калгас „Інтэрнацыянал“ правальвае з дню ў дзень выкананьне апэрацыйнага штодзённага пляну па ворыве і сяўбе. Як жа тлумачыць такое зьявішча старшыня калгасу камуніст Пазьнякоў? Прарыў ён бачыць у рабоце калгасьнікаў, брыгадзіраў, але ніяк не ў сваім дрэнным кіраўніцтве. Пазьнякоў у сваім выступленьні сфатаграфаваў становішча свайго калгасу, указаў усе адмоўныя бакі, але ўпіраў на тое, што ў яго няма брыгадзіраў і ні адным словам не абмовіўся аб тых захадах, якія ён прымае для ліквідацыі ганебнага адставаньня калгасу. Ён прыводзіў факт парушэньня працоўнай дысцыпліны ў калгасе, калі калгасьнік Каралёў пасьля абеду ня вышаў на работу. Тут-жа Пазьнякоў прызнаў, што да Каралёва дагэтуль ніякіх мер ня прынята.

У калгасе працягваюць цацкацца з гультаямі, прагульшчыкамі, з тымі, хто разбурае калгас. Так, былы старшыня калгасу Голідаў, выключаны з партыі, займаецца шкодніцтвам, разбурэньнем калгасу, але яшчэ ня выключаны з калгасу. Такія-ж адносіны наглядаюцца з боку праўленьня на чале з Пазьняковым у адносінах да гультаёў, прагульшчыкаў і зрыўшчыкаў працы Шамшура і Сафонава.

Старшыня калгасу «Сілач» тав. Якубенка адставаньне ў сяўбе свайго калгасу прабаваў тлумачыць выключна адсутнасьцю сталоўкі і ясьляў. Бязумоўна, што яны адыгрываюць значную ролю ў веснавой сяўбе, але чаму-ж Якубенка зусім забываў аб арганізацыі гэтай справы? Адначасова трэба ўказаць, што ў калгасе вельмі дрэнная працдысцыпліна. У калгасе маюцца шкодніцка кулацкія тэндэнцыі (разбраніваньне кармоў, разважаньні аб тым, што «яшчэ не наступіў час сяўбы»). Жаночая праца ў калгасе «Сілач» вельмі дрэнна скарыстоўваецца. Якасьць работы нездавальняючая, сеюць з агрэхамі, палі абязьлічаны. Якубенка, гаворачы аб чарапашых тэмпах сяўбы, дагаварыўся да таго, што «пры такім становішчы калгас напэўна ня скончыць сяўбу праз 2 нават і 3 месяцы». Камэнтары, як кажуць, не патрэбны.

Старшыня калгасу «Новы шлях» т. Багданаў таксама спысылаўся на „аб'ектыўныя“ ўмовы, на дрэннае конскае пагалоўе.

З выказваньнем выступаўшых згаджаўся і старшыня калгасу «Шлях Ільліча» Багданаў. Ён на сходзе ня выступіў, але пасьля сходу разьвёў дэмагогію аб немагчымасьці выконваць апэрацыйныя штодзённыя пляны палявых работ.

Гэтыя старшыні калгасаў і брыгадзіры—камуністы Даўжанскай парт'ячэйкі ходзяць з аднэй думкай, што яшчэ «не наступіў час сяўбы». Калі да гэтага дадаць тот факт, што член партыі, агратэхнік калгасу «Сілач» т. Рэйфэр замест напружанай работы нічога ня робіць, а загадчык МТФ—камуніст Відман таксама адвільвае ад работы, то стане яскравы твар значнай часткі камуністаў ячэйкі.

Трэба адзначыць бязьдзейнасьць камсамольскіх ячэек у сяўбе. Досыць указаць, што ніводная з іх за апошні месяц ня склікала сходаў для абгаварэньня задач пасеўнай кампаніі. Партыкіраўніцтва камсамолам вельмі дрэннае. Парт'ячэйка не клапаціцца аб камсамольскіх справах, не заслухоўвае камсамольскіх ячэек, ня кіруе імі.

З за апартуністычнага самацёку ў рабоце тэмпы сяўбы, як па калгасах, так і па аднаасобным сэктары, надзвычай марудныя. Кантрактацыя гародніны і ільну яшчэ ня скончана Масавая работа пры ўручэньні абавязацельстваў аб здачы дзяржаве збожжа і бульбы не разгорнута.

Вывад можа быць толькі такі: трэба разграміць апартуністычныя разважаньні, даць бязьлітасны адпор носьбітам іх і ўзяцца пабаявому за выкананьне баявых задач веснавой сяўбы. Трэба навярстаць упушчанае, чым хутчэй, тым лепш.

Казанскі.

БАЛЬШАВІЦКІЯ РАШЭНЬНІ ЦК—У МАСЫ.

Гэтымі днямі адбыўся агульны сход старасельскай парт'ячэйкі сумесна з камсамольцамі і калгасным актывам. На сходзе былі прапрацаваны пастановы ЦК КП(б)Б аб рабоце двох партыйных ячэек і аб складаньні сталых вытворчых брыгад.

Сход прайшоў вельмі актыўна. Усе брыгадзіры і старшыні калгасаў выступалі ў спрэчках, гаварылі аб становішчы брыгад, падрыхтоўцы да веснавой сяўбы На сходзе высьветлілася, што аграном Пісклігін зусім ня склаў вытворчых плянаў для садова-гародных брыгад. што дрэнна адбіваецца на рабоце гэтых брыгад.

Агульны сход ухвалыў бальшавіцкія рашэньні ЦК КП(б)Б аб рабоце двох партыйных ячэек і аб складаньні вытворчых брыгад. Сход пастанавіў стварыць партгрупы, у калгасах «1 мая», «Тружанік» і „Новае жыцьцё“ распачаць растрэбоўку рашэньняў ЦК КП(б)Б па брыгадах. На час правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі да кожнай брыгады прымацаваны камуністы, камсамольцы і настаўнікі, для правядзеньня палітмасавай работы.

На наступным бюро парт'ячэйкі вызначана заслухаць брыгадзіра першай брыгады калгасу «1 е мая» т. Масьляко а аб ходзе сяўбы і брыгадзіра садова-гароднай брыгады калгасу „Новае жыцьцё“ т. Урублеўскага аб ходзе сяўбы і рабоце брыгад.

Грыман.

НЕ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ.

Ячэйка КСМ пры В.-Лётчанскай школе сялянскай моладзі яшчэ да гэтага часу не пераключылася на правядзеньне веснавой сяўбы. Сэкратар ячэйкі Адаменка зусім не зьяўляецца ў ячэйку і камсамольцы застаўлены без усялякага кіраўніцтва. За апошні час ня было ніводнага камсамольскага сходу, камсамольцы ня ведаюць сваіх задач у веснавой сяўбе.

Ня лепш абстаіць справа ў ячэйцы КСМ калгасу „Культурны фронт“. Сэкратар ячэйкі Талкачоў ня кіруе ячэйкай. Нягледзячы на тое, што камсамольцаў прымацавалі да асобных брыгад, апошнія не працуюць і імі ня кіруюць, паміж брыгадамі не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва, камсамольцы не паказваюць прыкладу, як трэба працаваць.

Зараз-жа патрэбна выправіць гэтыя недахопы з тым, каб пры актыўным арганізуючым удзеле ячэек выйсьці пераможцамі ў правядзеньні веснавой сяўбы.

Рыг. Васільлеў.

Да агляду работы па дзярждаходах.

Аграмаднае значэньне, якое маюць выняткі з аграмаджанага сэктару народнае гаспадаркі ў справе выкананьня фінансавага пляну, прад'яўляе выключна адказныя запатрабаваньні да арганізацыі работы па дзярждаходах і раней за ўсё да таго апарату, які непасрэдна ажыцьцяўляе гэтыя важнейшыя функцыі.

Для бесьперабойнага выкананьня пляну па дзярждаходах, якія складаюць у 1933 г. звыш 80 проц. усёй даходнай часткі дзяржаўнага бюджэту, неабходна забясьпечыць такую пастаноўку работы на гэтым вучастку, якая-б гарантавала поўны ахоп і паглыбленае вывучэньне аб'ектаў, дакладнасьць вучоту, абавязковую праверку разьлікаў па абкладаньні і штодзённую, упартую барацьбу за жорсткае захаваньне гаспадарчымі арганізацыямі іх фінансавых абавязацельстваў перад дзяржавай.

Матар'ялы абсьледаваньня гаспадарчых арганізацый па гор. Віцебску сьведчаць аб тым, што рад прадпрыемстваў (Саюзрыбзбыт, ткацкая арцель, лесазавод і інш.) заражоны антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі захаваньня ад дзяржавы сваіх зваротаў, каб заплаціць у бюджэт меншую суму падатку і скарыстаць гэткую ў звароты свайго прадпрыемства. Таксама маецца цэлы рад арганізацый (люстэркавая фабрыка, арцелі «Уперад» і «Чырвоны апрацоўшчык», Белічаціна і інш.), якія зьяўляюцца злоснымі наплатнікамі плацяжоў у бюджэт, сыстэматычна скарыстоўваючы непералічаныя ў бюджэт падатковыя сумы для сваіх уласных зваротаў.

Усе гэтыя прадпрыемствы імкнуцца пакрыць свае прарывы па вытворчай і фінансавай дзейнасьці, якія атрымліваюцца з прычыны дрэннай арганізацыі работы, грашыма, украдзенымі ў дзяржавы.

Фінансавыя органы, якія практычна закліканы ўрадам ажыцьцяўляць прадстаўніцтва на мясцох дзяржаўнай улады ў галіне фінансаў, абавязаны даваць адпор усялякім праяўленьням месьніцкіх антыдзяржаўных тэндэнцый у справе выкананьня абавязацельстваў перад дзяржбюджэтам.

Агляд работы па дзярждаходах, які праводзіцца ў гэтым месяцы, павінен значна ўзмацніць фінансава-бюджэтную дысцыпліну на прадпрыемствах і ўсе недахопы, якія маюцца ў выкананьні фінансавых абавязацельстваў перад бюджэтам, павінны быць зьнішчаны.

Праводзімы агляд работы па дзярждаходах павінен выявіць і становішча апарату гарфінадзелаў па дзярждаходах.

Работа па дзярждаходах ня можа далей праводзіцца толькі адным фінапаратам Агляд работы павінен праводзіцца пад пунктам погляду арганізацыі сталай масава-палітычнай работы грамадзкасьці на барацьбу за дзярждаходы і сыстэматычнае выкананьне пляну паступленьня даходаў з аграмаджанага сэктару.

Для дапамогі інспэктару дзярждаходаў, які непасрэдна вядзе абкладаньне прадпрыемстваў аграмаджанага сэктару і адказвае за правільнае налічэньне і своечасовае паступленьне падатковых плацяжоў, на прадпрыемствах павінны быць арганізаваны фінансава-кантрольныя пасты з рабочых актывістаў і ўдарнікаў.

Асноўная задача фінкантрольных пастоў—сачыць за своечасовым і поўным узносам даных прадпрыемствам прылічваючыхся плацяжоў, а таксама правільным вылічэньнем зваротаў, прадстаўленьнем справаздач у фінансавыя крэдытныя органы Аб усіх выяўленых недахопах фінкантрольныя пасты павінны безадкладна паведамляць фіворганы, а таксама даводзіць да ведама парт'ячэйкі альбо ФЗМБ свайго прадпрыемства для прыняцьця мер.

Усесаюзны агляд па дзярждаходах павінен узьняць на палітычную вышыню значэньне штодзённай масавай работы ў гэтай галіне, прыцягваючы да гэтага важнейшага вучастку фінансавай работы сталы грамадзкі актыў і друк. Правільная арганізацыя агляду, бальшавіцкае яго правядзеньне павінны забясьпечыць датэрміновае выкананьне пляну па дзярждаходах у другім квартале і ў 1933 г.

Адам.

ПАСТАНОВА ЎРАДУ СССР АБ УДАРНЫХ БУДОЎЛЯХ.

30|IV 1933 г. у «Известиях» надрукавана пастанова Савету Народных Камісараў СССР аб ударных будоўлях на 1933 год.

Гэтай пастановай саюзным урадам вызначан цэлы рад ударных будоўляў па БССР: Жарабоўская вопытная цэлюлёзная ўстаноўка, Ласавінская біафабрыка, Гомельскі вэтсклад, Менская радыё-вяшчальная, Заходняя шаша.

Па Наркамземе вызначана 49 ільнопеньказаводаў і 38 рамонтных майстэрань, у тым ліку па сыстэме Збожжатрактарацэнтру—13 майстэрань, Гароднябульбатрактарацэнтру—13, Ільнотрактарацэнтру—12. Ва ўдарныя будоўлі ўнесены насеннахавальнікі сыстэмы Казлоўскага, Менская сэлекцыйная цэнтральная станцыя. Апрача гэтых аб'ектаў саюзны ўрад выдзеліў па Наркамсавгасаў на рамонтныя майстэрні 0,15 млн. руб, на сіласаваньне—0,2, на вэтбудоўлі—0,35.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ.

— Урачыстае адчыненьне летняга сэзону ў доме адпачынку „Заольша“ адбылося 3 мая. У гэтым годзе дом адпачынку прапусьціць 2800 асоб. Дадаткова да летняга сэзону пабудавана новая летняя сталоўка

— Новы маладзёжны камсамольскі дом адпачынку адкрывае страхкаса сумесна з гаркомам КСМ на летні сэзон 1933 г. Прапускная здольнасьць дому адпачынку 1.000 чал. за сэзон. Урачыстае адчыненьне дому адпачынку і прыезд першай зьмены адбудзецца 15 мая.

— Новая сталоўка для інжынэрна-тэхнічных работнікаў адкрываецца 15 мая па вул. «Правды». Прапускная здольнасьць сталоўкі 650 чал. у дзень. Гэта сталоўка забясьпечвае ўсіх ІТР харчаваньнем. Былое памяшканьне сталоўкі пераходзіць у распараджэньне гарпрафсавету і будзе абслугоўваць прафактыў.

— Першае месца ў гаралзэкім спаборніцтве на варашылаўскага стралка заняла т Харкоўская—лепшая ўдарніца фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі». У час спаборніцтва яна выбіла 50 ачкоў, што складае 100 проц. пападаньня.

— Першае месца па БССР па выкананьні праграмы сплаву заняла Віцебская сплаўкантора. Да дню 1-га мая выкананьне ліпеньскага пляну па сплаве складае 85,7 проц.

— 20 кіно-мэханікаў выпусьціў кіно тэхнікум датэрмінова. (У тры месяцы замест чатырох).

— Мабілізаваць групу рахункавых працаўнікоў гораду для наладжваньня вучоту ў калгасах пастанавіў прэзыдыум гарсавету. Працаўнікі прабудуць на месцах 10 дзён.

— 8 мая, а 6 й гадзіне ўвечары, у вялікай залі гаркому КП(б)Б склікаецца НАРАДА СЭКРАТАРОЎ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК. Пэрсанальна павінны зьявіцца: Рубінштэйн (кіно), Красьнік (гарсавет), Ваўчок (камбінат), Гаеўскі (масгацкі тэхнікум), Гельфанд (гарздраў), Пячатнікаў (гарсавет), Прудзікаў (Савпартшкола), Пэскін (гарКК-РСІ), Арлоўскі (ТПД), Абелеў (пракурат.), Астроўская (ГК КП(б)Б), Астрага (міліцыя), Бляяеў (швэйны тэхнікум), Бардзюкова (ГК КП(б)Б), Баскія („КІМ»), Дабравольскі (Дом працасьветы), Жалезьняк (вэтінстытут), Зьвяніна (страхкаса), Кавалёнка (фінтэхнікум), Кац (прамбанк), Каган (саюз працмастацтва), Кронэнбэрг (камвуз), Каханоўскі (Белпадтэхнікум), Ліпстэр (Алтэкакіраўніцтва) Рабкін (тэкстыльтэхнікум), Сланімская (медтэхнікум), Фрэйдзінзон (Камунгас), Фрыз (гарсавет), Фляумэнбаўм (гарліт), Чарноўскі (гарсавет), Шамес (вэтрабфак), Эстрын (банк), Якаўлеў (пэдрабфак), Шубік (прапагандыст), дырэктар пэдінстытуту, Бляхмая (Аўтадор).

ГК КП(б)Б.

ПЕРШАЕ МАЯ ЗА МЯЖОЙ.

Польшча.

ВАРШАВА, 2. 1 мая ў Варшаве спынілі работу ўсе важнейшыя фабрыкі. Баставаў паравозны завод, амаль поўнасьцю стаялі цэнтральныя чыгуначныя майстэрні, ваенныя заводы «Урсус», дзяржаўны авіазавод, знарадны завод, завод «Поціск», дзяржаўны кулямётны завод і інш. У радзе месц адбыліся рэвалюцыйныя дэманстрацыі і масоўкі Паліцэйскія атрады, пад кіраўніцтвам спэцыяльна-створанага штабу, з выключнай жорсткасьцю накідваліся на выступаўшых рабочых. Асабліва баявы характар мелі рабочыя дэманстрацыі ў Охоце і Повонзках (рабочыя прадмесьці Варшавы), дзе 50 дэманстрантаў палвергліся нападу з боку паліцэйскіх атрадаў. Шмат рабочых жорстка зьбіты.

Буржуазны друк адзначае ўпартасьць і настойлівасьць першамайскіх рэвалюцыйных выступленьняў. «Вечор Варшавскі» заяўляе: «2.000 мабілізаваных паліцэйскіх незмаглі папярэдзіць масавых выступленьняў камуністаў». У Дамброўскім басэйне першамайская забастоўка ахапіла большасьць капальняў і прадпрыемстваў У Лодзі, апрача шматлікіх камуністычных масовак, адбыліся дзьве буйныя камуністычныя дэманстрацыі. З Верхняй Сілезіі паведамляецца аб шматлікіх дэманстрацыях рэвалюцыйных рабочых.

Германія.

БЭРЛІН, 3. Паводле рашэньня нац.-сацыялісцкай партыі, 1 мая было арганізавана «сьвята нацыянальнай працы». Па вуліцах гораду былі разьвешаны плякаты, заклікаючыя «шанаваць нямецкую працу», «слухацца правадыра» г. д. Быў мабілізаван увесь паветраны флёт, у тым ліку 1 дырыжабль «Граф Цэпэлін». У Бэрліне дзень «нацыянальнай працы» пачаўся парадам сярэдніх і вышэйшых школ у Люстгарцене, дзе выступіў з прамовай прэзыдэнт Гіндэнбург На Тэмпэльгофскім аэрадроме выступіў з прамовай аб праграме работ першага году „чатырохгадовага пляну“ Гітлер.

У Мэзэрыц у дзень „нацыянальнай працы“ масовая арганізацыя „Сталёвага шлёму“, якая ўдзельнічала ў нац. сацыялісцкай дэманстрацыі раптоўна вышла з радоў дэманстрантаў і ня прыняла ўдзелу ў мітынгу на гарадзкім пляцы. Паводле слоў агенцтва, паліцыя ў сувязі з гэтым арыштавала кіраўнікоў мясцовай арганізацыі „Сталёвага шлёму“.

У Мангэйме арыштавана трое чалавек, якія абвінавачваюцца ў тым, што яны напярэдадні 1 га мая расклейвалі камуністычныя плякаты. У Нэкараў арыштавана 27 чалавек, па падазрэньні ў тым, што яны напярэдадні 1 га мая распаўсюджвалі ў вялікай колькасьці камуністычныя адозвы.

Чэха-Славакія.

ПРАГА. 2. Першага мая па ўсёй краіне адбылося звыш 400 камуністычных выступленьняў. Колькасьць удзельнікаў дэманстрацый і мітынгаў, якія праводзіліся на аснове адзінага фронту, значна перавысіла лік удзельнікаў легашніх першамайскіх выступленьняў. Уплыў сацыял фашыстаў у гэтым годзе значна зьменшыўся. Гэта асабліва ярка праяўлялася ў пагранічных з Германіяй раёнах, дзе, нягледзячы на супраціўленьне с.-д. лідэраў. адбыліся сумесныя дэманстрацыі камуністаў з рэфармісцкімі рабочымі. У АШЫ дэманстравала 15 тысяч рабочых, у БРНО—10 тысяч рабочых, у Райхэнбэргу і Кладно—па 8 тысяч рабочых, у Брукса—4 тыс. рабочых.

Першамайская камуністычная дэманстрацыя ў Празе сабрала, нягледзячы на дождж, ня менш 10.000 рабочых, у два разы больш, чым сац.-дэмакратычная. Пасьля дэманстрацыі адбыўся 12-тысячны мітынг, на якім выступалі камдэпутат Готвальд і інш. Прынятая рэзалюцыя заклікае да барацьбы з фашызмам і падрыхтоўкай антысавецкай інтэрвэнцыі.

У Паўночна-Чэскай горнай вобласьці ў 15 пунктах пад камуністычнымі сьцягамі дэманстравала каля 43 тысяч горнякоў. У БРНО паліцыя напала на дэманстрантаў, якія сьпявалі „Інтэрнацыянал“, і канфіскавала 10 сьцягаў. У Братыславе дэманстранты прабавалі сарваць фашысцкі сьцяг, вывешаны над будынкам германскага консульства. Конная паліцыя абступіла рабочых і ўвесь дзень узмоцнена ахоўвала будынак. У Нітры (Славакія) пры разгоне дэманстрантаў паранена шмат рабочых.

На першамайскіх мітынгах, якія праводзіліся ў радзе месц, прымаліся рэзалюцыі аб удзеле ў эўрапейскім антыфашысцкім кангрэсе.

Аўстрыя.

ВЕНА, 2. Раніцой першага мая ў Вене вайсковыя часьці з гаўбіцамі, кулямётамі і паходнымі кухнямі занялі рад дзяржаўных і грамадзкіх будынкаў у цэнтры гораду. Усе вуліцы, якія вядуць да цэнтру, былі агэплены працаднымі загародамі, за якімі былі выстаўлены кулямёты і падвойныя лініі салдат. Кавалерыйскія атрады, бранявікі. грузавікі з войскам і жандармэрыяй рыскалі па ўсім горадзе. У рабочых раёнах узмоцненыя жандарскія атрады заселі на цэрквах і дамох. Цэлы дзень па горадзе раздаваліся гукі сыгнальных труб. Канцлер Дольфус і ваенны міністр Вогуэн асабіста аглядалі „ўмацаваньні“ цэнтральных бульвараў.

Нягледзячы на забарону, на вуліцу выйшла каля 200 тысяч сацыял дэмакратычных і камуністычных рабочых. Як відаць, у адпаведнасьці з заключанаю згодаю, с-д. партыя абавязалася не дапускаць дэманстрантаў у раён цэнтральных бульвараў; узамен гэтага ўрад абавязаўся неафіцыяльна дазволіць дэманстрацыю па за цэнтральнымі вуліцамі. Нягледзячы на ўсе ўгаворы с.-д. функцыянэраў мірна варочацца дамоў, адбыўся рад сутычак паміж рабочымі, якія прабавалі прабрацца ў цэнтр, з аднаго боку, паліцыяй і нацыянал сацыялістамі—з другога. Арыштавана каля 300 рабочых.

У Грацы адбываліся сутычкі паміж рабочымі і нацыянал сацыялістамі Шмат параненых з абодвух бакоў. У Вінэрнэйштадце паранена 20 чалавек. У Альпейне напярэдадні першага мая ў сутычках ранен жандарм; 2 рабочых атрымалі штыхавыя раны. У Браунаў у сутычках паміж нацыянал-сацыялістамі і рабочымі 9 чалавек паранена, з іх адзін цяжка У Трэйзэне некалькі сот камуністаў былі разагнаны войскам якое пусьціла ў ход штыхі. У Фойцбэргу вялізны натоўп с.-д. і камуністаў спрабаваў сарваць фашысцкія сьцяг і на галоўным пляцу. Дэманстранты былі разагнаны падасьпеўшымі з Грацу войскамі. У Мэдлергу насустрач паліцэйскім штыхам выходзілі жанчыны і раскрывалі грудзі з крыкам: „каліце, мы не баімося“. Нацыянал-сацыялісты прабавалі штурмаваць адзін населены камуністамі дом. У сувязі з падзеямі ў Альтхэйме, згодна паведамленьняў газэт, урад рыхтуецца забараніць кампартыю.

Францыя.

ПАРЫЖ, 2. Паводле паведамленьня „Юманітэ“, першае мая адзначана францускім пралетарыятам буйнымі дэманстрацыямі, масавымі стачкамі, мітынгамі. У парыскім прадмесьці Вэнсенскі лес адбылася грандыёзная дэманстрацыя, арганізаваная кампартыяй і ўнітарнымі прафсаюзамі пад лёзунгам барацьбы за адзіны фронт супроць фашызму і імпэрыялістычнай вайны пры ўдзеле 70.000 чалавек. Тысячы бастуючых рабочых заводаў Сітроена ўдзельнічалі ў дэманстрацыі Па сканчэньні дэманстрацыі адбыўся мітынг Прамоўцы ўказвалі, што сацыялісты аддалі перавагу абмежаванаму ў дзень 1-га мая мітынгам у невялікай гарадзкой залі для таго, каб ня сустрэць бастуючых рабочых Сітроена. Марсэль Кашэн у сваім выступленьні падкрэсьліў. што сьвет стаіць напярэдадні вялікіх сацыяльных канфліктаў, быць можа новай сусьветнай вайны.

Па сканчэньні мітынгу адбылася сутычка паміж дэманстрантамі і паліцыяй. Ёсьць параненыя. На вялікай колькасьці прадпрыемстваў рабочыя першага мая спынілі работу.

У Ліёне адбылася трохтысячная вулічная дэманстрацыя пад сьцягамі ўнітарных прафсаюзаў. У Гаўры баставалі ўсе докеры, 50 проц. вугальшчыкаў, 80 проц. землекопаў, значная частка металістаў.

ПАЗШ.

НЬЮ-ЁРК, 2. У выключна магутнай першамайскай дэманстрацыі адзінага фронту ў Юніён-Сквэры ўдзельнічала звыш 100.000 чалавек. На працягу 4 х гадзін дэманстранты ішлі праз прамысловыя і гандлёвыя раёны. У дэманстрацыі якой кіравала кампартыя, прымалі ўдзел сіндыкалісты, анархісты, левыя сацыялісты. На асобным мітынгу, арганізаваным сац. партыяй, удзельнічала 20.000 чалавек. Па сканчэньні мітынгу многія тысячы членаў сацыялістычнай партыі прынялі ўдзел ў аб'яднанай дэманстрацыі адзінага фронту

35 тысяч чалавек дэманстравала першага мая ў цэнтральных раёнах Чыкага. На мітынгу прымала ўдзел 10 тысяч рабочых. У Дэтройце ў дэманстрацыі прымала ўдзел 65 тысяч рабочых, у Філядэльфіі—20 тысяч рабочых, у Мінэаполісе - 5 тысяч і ў Мільвокі—10 тысяч У Кандэне ў аб'яднаных дэманстрацыях камуністаў і сацыялістаў прымала ўдзел 5 тысяч рабочых. У Пітсбургу напярэдадні першага мая паліцыя арыштавала 15 мясцовых кіраўнікоў камуністаў і савету беспрацоўных. У Лос-Анжэлосе паліцыя атакавала і разагнала дэманстрантаў. Арыштавала 5 чалавек. Некалькі чалавек цяжка паранена.

1-га мая раніцой у Чыкага з аўтамабіляў, што шпарка імчаліся, былі кінуты бомбы, якімі нязначна папсаван будынак тэлефоннай станцыі. буйны магазын і тры іншых будынкі. Начальнік паліцыі, які правакацыйна прыпісваў замах „камуністычным першамайскім дэманстрацыям“, аддаў загад аб арышце ўсіх камуністаў у Чыкага.

Японія.

ТОКІЁ, 2, На першамайскай дэманстрацыі ў Асако (найбуйнейшы цэнтр Японіі) удзельнічала 15.000 рабочых, выступаўшых адзіным фронтам пад лёзунгамі барацьбы за адзінства рабочае клясы, барацьбы супроць фашызму і з патрабаваньнямі павышэньня зарплаты. У Асако арыштавана 150 дэманстрантаў. На першамайскай дэманстрацыі ў Іокагаме ўдзельнічала 1.000 рабочых, арыштавана 13 чалавек.

Англія.

ЛЁНДАН, 2. У першамайскай дэманстрацыі адзінага фронту ў Гайдпарку ўдзельнічала 10.000 чал., у тым ліку многія мясцовыя аддзелы трэд'юніёнаў, розныя каапэрацыйныя аб'яднаньні. Зьвяртала на сябе ўвагу група 300 студэнтаў Оксфорда ага, Кембрыджскага і Лёнданскага ўнівэрсытэтаў з лёзунгам „Ядвайцеся для барацьбы супроць вайны“. Сярод выступаўшых прамоўцаў былі Гары Паліт і лідэр незалежнай рабочай партыі Фэнэр Брокуей. У першамайскай дэманстрацыі ў Глазго ўдзельнічала 15.000 рабочых.

ПАСТАНОВА ВІЦЕБСКАГА ГАРФІНАДДЗЕЛУ

ад 4-га мая 1933 г.

На падставе п 22 пастановы ЦВК і СНК БССР (3. 3. 1931 г., арт. 199, за сыстэматычнае непрадстаўленьне ў тэрмін падатковых справаздач па падатку са звароту і бюджэтных нацэнак, Віцебскі гарфінаддзел пастанаўляе:

1. Накласьці штраф на прадпрыемствы, кіраўнікоў і галоўных бухгальтараў, не даслаўшых справаздач:

Назва прадпрыемства	За які час не прадстаўлена справаздач.	На ўстанову ў суме	Кіраўнік	Сума	Галоўбух	Сума
1. Саюзбавоўназбыт	Сакавік	500 р.	Пучлер	25 р.	Фрадкін	50 р.
2. Гаруцількамбінат	„	200 р.	Пынкевіч	25 р.	Блюмін	25 р.
3. Белгандаль . . .	Студзень Люты Сакавік	500 р.	Бэйлін	50 р.	Розін	75 р.
4. Плодаягадны завод	Перарэзьлік за 1932 г.	1000 р.	Калесьнікаў	75 р.	Блажэвіч	75 р.
5. ТСТ воднікаў . .	Люты Сакавік	200 р.	Матлін	30 р.	Варшчаў	30 р.
6. ЗРК «Дзьвіны» . .	„	200 р.	Іваноўскі	50 р.	Акаловіч	50 р.
7. ЗРК „КІМ“ . . .	Студзень Люты Сакавік	200 р.	Выдрэвіч	50 р.	Мамантаў	50 р.
8. ЦРК	„	300 р.	Гіцовіч	50 р.	Гурэвіч	50 р.
9. Хімлябараторыя „Зара“ . . .	„	300 р.	Сідура	50 р.	Белькевіч	50 р.

2. Сумы штрафу павінны быць унесены ў віцебскае аддзяленьне Дзяржбанку ў пяцідзённы тэрмін са дню выданьня гэтай пастановы, з паведамленьнем аб тэрміне ўплаты ў гарФА.

Загадчык гарФА АДАМ.

Ст. інспэктар па дзярждаходах БЭРМАН.

ГАРСТРАХКАМІТЭТ

У ДРУГІ РАЗ даводзіць да ведама ўсіх прадпрыемстваў гораду Віцебску аб тым, што зараз-жа неабходна прадставіць страхкасе заяўкі аб тэрміне чарговага адпачынку прадпрыемства ў гэтым годзе з дакладным паказаньнем месяцу і чысла.

Непрадставіўшыя заяўкі будуць атрымліваць месца ў дом адпачынку ў няплянавым парадку. СТРАХКАСА. 410—1—1

Даводзіцца да ведама калгасаў, савгасаў, МТС, аднаасобнікаў і іншых спажыўцоў, што на час ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ВІЦЕБСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ БЕЛСЕЛЬГАСНАБУ І ЯГО РАЁННЫЯ СКЛАДЫ ПРАЦУЮЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА і ў выходныя дні.

396—3—2

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ

Замаўленьне № 12. Друкарня „Маяк індустрыі“, Вальная, 21.